ISSN 0321-1649 (print)

## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*
LITERARY SCIENCE

УДК 82.09:82-145

Паступіў у рэдакцыю 19.04.2016
Received 19.04.2016

**А. С. Панфілава**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ГЕРМЕНЕЎТЫКА ЖАНРУ ФІЛАСОФСКАЙ ЛІРЫКІ

Проблема терминологического определения понятия «философская лирика» исследуется в контексте с такими категориями поэтики литературы, как жанр, стиль, художественный метод. В современных литературоведческих исследованиях, посвященных философским аспектам белорусской литературы, отсутствует однозначное определение понятия «философская лирика», которое часто заменяется другими: интеллектуальная лирика, поэзия мысли, медитативная лирика, философско-медитативный лироэпос, научная лирика, поэзия постижения, размышляющая лирика. В литературоведческих исследованиях выделяются три магистральных подхода в изучении философской лирики: рецептивный, типологический и исторический. Аналитический обзор основных подходов в рассмотрении художественной структуры философской лирики дает основания характеризовать ее как универсальную и синкретическую. На основе анализа исследовательских стратегий белорусских и русских литературоведов выделены характерные особенности изучения философской лирики.

*Ключевые слова:* философская лирика, терминологическая нестабильность, жанр, исторический метод, интеллектуализм.

**A. S. Panfilova**

*Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## HERMENEUTICS OF THE PHILOSOPHICAL LYRICS GENRE

The problem of the terminological definition of “philosophical lyrics” is studied in the context of such categories of the literature poetics as genre, style and artistic technique. In modern literary studies which consider the philosophical aspects of Belarusian literature, there is no unequivocal definition for the concept of “philosophical lyrics;” it is often replaced by other concepts: intelligent lyrics, poetry of thoughts, meditative lyricism, philosophical and meditative lyro-epos, scientific poetry, metaphysical poetry, spiritual and irrational poetry, poetry of comprehension, and contemplating lyrics. There are three main approaches to the study of philosophical lyrics: receptive, typological, and historical. The analytical review of the main approaches to the consideration of the artistic structure of philosophical lyrics makes it possible to speak about its universal and syncretic character. Based on the analysis of research strategies used by Belarusian and Russian literary scientists, distinct characteristics of philosophical lyrics have been identified.

*Keywords:* philosophical lyrics, terminological instability, genre, historical approach, intellectualism.

Сучасныя навуковыя веды маюць выражаны сінкрэтычны характар: гуманітарныя навукі арыентаваны на сціранне міждысцыплінарных межаў, пераадоленне інстытуалізацыі гуманітарных ведаў. Мовацэнтрызм як даследчыцкая стратэгія выступае яднаючым фактарам разнастайных галін гуманітарыстыкі. У сучасных даследаваннях адзначаюцца ўзаемадзеянні літаратуразнаўства з лінгвістыкай, культуралогіяй, семіётыкай, сацыялогіяй, псіхалогіяй, філасофіяй. Асобнай манаграфіяй у 2014 годзе выйшла праца доктара філалагічных навук, прафесара М. А.Тычыны “Філасофія літаратуры”, прысвечаная выяўленню філасофскага зместу праблем літаратурнай тэорыі, тэарэтыка-канцэптуальнаму асэнсаванню сучаснай літаратурна-мастацкай сітуацыі і вызначэнню глыбінных тэндэнцый і інавацыйных стратэгій.

Мастацкая літаратура, як і філасофія, выклікае падзейнасць думкі, але ў адрозненне ад апошняй не карыстаецца наборам аргументаў, якія можна пераняць у Платона, Канта, Гегеля і іншых філосафаў, а зыходзіць з падзейнасці самой мовы. Так сціраюцца межы паміж уласна філасофскім творам і творам мастацкай літаратуры ў класічным яго разуменні.

Асабліва цеснае ўзаемадзеянне філасофіі і літаратуры адбываецца з сярэдзіны XIX ст., менавіта ў гэты час пачынаюць фарміравацца філасофска афарбаваныя літаратурныя плыні. Так, у рускай літаратуры філасофская лірыка актыўна развіваецца дзякуючы дзейнасці гуртка

© Панфілава А. С., 2017

“Общество любомудрия”. Удзельнікаў гуртка – Д. Веневіцінава, А. Кашалёва, У. Адоеўскага, С. Хамякова – аб’ядноўвала цікавасць да ідэі нямецкага рамантызму аб збліжэнні філасофіі і паэзіі. З’яўляецца шэраг мысліцеляў, творчасць якіх складана аднесці толькі да адной гуманітарнай сферы. Філосафы ўсё болей імкнуцца да паэтычнага афармлення сваёй думкі (так, Ф. Ніцшэ рэалізаваў свае паэтычныя здольнасці ў працах “Вясёлая навука”, “Так казаў Заратустра”, У. Салаўёў развіваў свае ідэі ў лірычнай форме). Паэзія ўскладняецца, дысцыплінарныя каноны парушаюцца. Гёльдэрлін сродкамі паэзіі фармуляваў філасофскія ідэі і стаў пачынальнікам традыцыі нямецкай паэтычнай філасофіі, да якой належалі Навaліс, Тракль, Рыльке, Цэллан. Пра значнасць узаемадзеяння філасофіі і паэзіі пісалі філосафы М.Хайдэгер (“Тлумачэнні да паэзіі Гёльдэрліна”), М. Бланшо (“Прастора літаратуры”), А. Бадью (“Маніфест філасофіі”), Ж. Дэрыда (“Ці ёсць у філасофіі свая мова?”) і інш. Філасофія экзістэнцыялізму выйшла за межы трактатаў М. Хайдэгера і К. Ясперса і развівалася ў драматургіі і прозе А. Камю, Ж.-П. Сартра і інш.

У сучасных літаратуразнаўчых даследаваннях, прысвечаных філасофскім аспектам беларускай літаратуры, адсутнічае адназначнае азначэнне паняцця “філасофская лірыка”, якое часта замяняецца іншымі: інтэлектуальная лірыка [7], паэзія думкі [14], медытатыўная лірыка [16], філасофска-медытатыўны ліраэпас [19], навуковая лірыка, метафізічная лірыка, духоўна-ірацыянальная лірыка, паэзія спасціжэння, роздумная лірыка. Складанасць у азначэнні тэрміна шмат у чым абумоўлена неаднароднасцю эмпірычнага матэрыялу, што выклікае патрэбу ў яго ўмоўнай каталагізацыі. Праблема вызначэння змястоўных і фармальных межаў філасофскай лірыкі мае выхад на праблему тэорыі жанру, на выпрацоўку аптымальнай метадалагічнай стратэгіі.

На неадназначнасць разумення асобных тэарэтыка-літаратурных тэрмінаў (такіх, як “метад”, “напрамак”, “від”, “жанр” і інш.) рознымі даследчыкамі мастацкай літаратуры звярталі ўвагу В. П. Рагойша [17, с. 77–78], Я. А. Гарадніцкі [7, с. 402].

Паводле назірання ўкраінскага літаратуразнаўцы І. У. Козліка, “у даволі вялікай колькасці літаратуразнаўчых прац альбо проста ўзнаўляюцца састарэлыя тэарэтыка-літаратурныя канцэпцыі (зноў і зноў тлумачыцца іх логіка і даказваецца іх сапраўднасць; у гэтым выпадку спрацоўвае фактар аўтарытэтнасці), альбо на канкрэтным гісторыка-літаратурным матэрыяле тэарэтычныя пастулаты ці дэфініцыі ілюструюцца без усведамлення праблематычнасці прадстаўляемых імі тэарэтычных канцэпцый (у гэтым выпадку тэарэтычная база бярэцца гатовай і толькі “прыкладаецца” да канкрэтнага эмпірычнага матэрыялу)” [13, с. 4] (тут і далей пераклад А. С. Панфілавай).

У залежнасці ад метадалагічнай установкі даследчыка і ўзроўню навуковай абстракцыі адрозніваецца вызначэнне структурнай прыналежнасці твора, а само паняцце “філасофская лірыка” напаўняецца розным зместам. У сучасных даследаваннях вылучаюцца тры магістральныя падыходы да вывучэння філасофскай лірыкі: рэцэптыўны, тыпалагічны і гістарычны.

Рэцэптыўны падыход у азначэнні тэрміна “філасофская лірыка” прадстаўлены канцэпцыяй прасторавага разумення жанру, распрацаванай І. У. Козлікам у манаграфіі “Тэарэтычнае вывучэнне філасофскай лірыкі і актуальныя праблемы сучаснага літаратуразнаўства” (2011). Пад філасофскім лірычным творам разумеецца верш, у якім для адэкватнага ўспрымання рэцэпіентам і аналізу патрабуецца свядомае рэканструяванне жанравай прасторы, аднароднай па родавым паходжанні і вектары тэматызацыі. У сувязі з разнастайнасцю паэтычных форм, у якіх увасабляецца філасофская лірыка, І. У. Козлік прапаноўвае размежаваць паняцці жанру як віду роду альбо тыпу твора і жанру як тэндэнцыі, што рэалізуецца ў вялікай гісторыка-літаратурнай прасторы, разнастайнай па сваім тэкставым матэрыяле. Дзякуючы такому аспекту разгляду асноўная ўвага пры аналізе лірычных тэкстаў пераносіцца з праблемна-тэматычнага на мастацка-зместавы вектар яго тэматызацыі. Жанравыя мадыфікацыі філасофскай лірыкі часта ўзнікаюць у смежных прадметна-тэматычных сферах і пры гэтым застаюцца дыферэнцыйнымі відамі аднаго роду. Так, філасофская лірыка з моманту з’яўлення літаратуры рэалізоўвалася як лірыка рэлігійна-філасофская, маральна-філасофская, любоўна-філасофская, пейзажна-філасофская і інш. Структурастваральным фактарам аднесенасці да філасофскай лірыкі выступае тэма, а не прадмет.

У межах тыпалагічнага падыходу ў сферу даследавання трапляюць універсальныя структурныя і тэматычныя прыкметы філасофскай лірыкі. У працы даследчыцы Р. С. Співак [18, с. 12] за структурастваральны крытэрый філасофскай лірыкі прымаецца прадмет мастацкага выяўлення, у якасці якога выступаюць родавыя, сутнасныя асаблівасці свядомасці чалавека. Філасофская лірыка разглядаецца як структурны варыянт лірыкі, прадмету выяўлення надаецца большае значэнне, чым тэме. Г. М. Паспелаў [15, с. 92] разглядае філасофскую лірыку разам з лірычнымі творамі псіхалагічнага і маральна-грамадскага ідэйнага зместу як разнавіднасць лірыкі рэфлексіўна-медытатыўнага тыпу. Крытэрыем аднесенасці да філасофскай лірыкі выступае канкрэтны змест.

Гістарычны падыход да філасофскай лірыкі патрабуе звароту да гістарычнага кантэксту твора. Пошук вытокаў і шляхоў станаўлення філасофскай лірыкі ў рускай літаратуры прадстаўлены працамі В. М. Жырмунскага, Л. Я. Гінзбург, Я. А. Маймін. Структурастваральным фактарам аднесенасці да філасофскай лірыкі выступаюць тэма і асноўныя ідэі, закладзеныя ў творы. Даследчыкі вылучаюць у рускай філасофскай паэзіі XIX ст. анталагічныя пытанні жыцця і смерці, натурфіласофскую праблематыку. Працэс выпрацоўкі стылю філасофскага верша адбываўся ў перыяд ломкі класіцыстычнай жанравай сістэмы. Вытокі жанравых рыс філасофскага верша даследчыкі бачаць у архаічным стыле оды, лірычнай медытацыі – у сузіральнасці элегіі. Выкарыстанне гістарычнага падыходу пры аналізе літаратурных з'яў патрабуе зыходзіць з пазіцый эвалюцыянізму: новы жыццёвы матэрыял увасабляецца ў новай форме, таму пошук крытэрыю аднесенасці да філасофскай лірыкі ў форме твора ці яго змесце для гістарычнага падыходу не актуальны.

У беларускім літаратуразнаўстве адной з першых прац, прысвечаных беларускай філасофскай паэзіі, з'яўляецца манаграфія Л. Я. Гараніна "Філасофскія пошукі ў беларускай літаратуры" (1984). Даследчык вылучае тры ўзроўні разумення "філасофскае" ў літаратуразнаўстве. Першы, "маральна-этычны ўзровень" філасофскай праблематыкі ў літаратуры найбольш шырокі і шматзначны па сваім змесце. На гэтым узроўні праяўляецца "схаваная ў творы думка (мастака, героя) пра чалавека і свет" [8, с. 44]. Змест тэрміна "філасофскі" на гэтым узроўні мае ацэначны характар: так часта характарызуюць у літаратурнай крытыцы глыбокія і ёмістыя па сваім мастацкім змесце творы. Трэба адзначыць, што на такім узроўні разумення адбываецца падмена паняцця "філасофскі" паняццем "высокамастацкі", але факт прыналежнасці твора да філасофскай лірыкі не з'яўляецца паказчыкам яго ідэйнай сталасці ці высокага мастацкага майстэрства. На другім узроўні разумення мастацкі твор разглядаецца на прадмет увасаблення светапоглядных і філасофскіх установак пісьменніка, аналізуецца пераважна ідэйная складаючая твора. Як адзначае Л. Я. Гаранін, такое разуменне паняцця "філасофская літаратура" належыць эстэтыцы і тэорыі літаратуры. Аднак даследаванне толькі філасофска-эстэтычных поглядаў пісьменніка належыць да гісторыка-літаратурных задач, а не да тэорыі літаратуры, бо сувязь філасофскіх поглядаў з іх мастацкім увасабленнем апасродкаваная. Расійскі літаратуразнавец У. В. Агеносаў у сувязі з гэтым адзначаў: "Вобразна-мастацкая сістэма Чарнышэўскага і Дастаеўскага была нашмат больш філасафічная, чым іх навукова-тэарэтычныя погляды. Іншымі словамі, абагульненне і пазнанне ў мастацтве не разрываюць сувязі з мастацкім вобразам" [1, с. 5]. Уплыў пэўнай філасофскай сістэмы характэрны для кожнага мастацкага твора ў розныя эпохі і таму не можа выступаць маркіруючым фактарам прыналежнасці да канкрэтнага літаратурнага жанру. Трэці ўзровень разумення Л. Я. Гаранін звязвае з "вылучэннем філасофскай праблематыкі (канцэпцый, ідэй, жыццёвых прынцыпаў і прынцыпаў мастацкага пазнання) у самастойную сферу мысленчай дзейнасці, з ператварэннем яе ў спецыфічны аб'ект мастацкага мыслення" [8, с. 14]. Крытэрыем аднесенасці твора да філасофскай лірыкі выступае дамінанта філасофскага канцэпту ў прадметна-стылявой структуры твора. Філасофскае разглядаецца ў адзінстве зместу і мастацкай формы. Такі падыход пры аналізе твораў выкарыстоўваецца ў шматлікіх даследаваннях беларускай паэзіі. Аднак паняцце філасофскай праблематыкі даследчыкі вельмі часта пашыраюць да ўсёй сферы духоўнай дзейнасці, уключаючы маральную, рэлігійную, сацыяльную і інш. Такім чынам адбываецца падмена філасофскага інтэлектуальным і прадмет паняцця "філасофскае" аказваецца няпэўным, размытым, таму акцэнт пераносіцца з прадметнага на тэматычны бок.

Я. А. Гарадніцкі ў манаграфіі “Думка і вобраз. Праблема інтэлектуалізму ў сучаснай беларускай лірыцы” (1986) прапаноўвае разглядаць паняцці “філасофская лірыка” і “паэзія думкі” як два бакі аднаго літаратурнага працэсу інтэлектуалізацыі лірыкі. Паняцце “паэзія думкі” шырокае і ўключае ў сябе і “філасофскую лірыку” ў тым ліку, разам з тым філасофскі светапогляд паэта можа вызначаць творчасць паэта ў цэлым [6, с. 9]. Трэба адзначыць, што тэрмін “паэзія думкі” ўвёў А. С. Пушкін, калі характарызаваў паэзію Я. А. Баратынскага. Паэзія пачуцця проціпастаўлялася паэзіі думкі, якая тлумачыла сутнасць з’яў, мысліла, у якой прадметам мастацкага даследавання становіцца сама думка. Баратынскі лічыў гэтыя ўласцівасці неад’емным складнікам сапраўднай паэзіі ўвогуле, прызначэнне якой у вытлумачэнні незямных, вышэйшых ісцін. Пад філасофскай лірыкай Я. А. Гарадніцкі разумее “тыя вершы, у якіх мастацкая думка паэта асвятляе тыя або іншыя спецыфічныя быційныя пытанні: жыццё і смерць, вечнасць, час, дабро і зло, прыгажосць, адносіны чалавека да прыроды” [6, с. 10]. Паняцце філасофскага прадстаўлена вельмі шырока, таму даследчык вымушаны казаць аб сціранні граняў паміж філасофскай лірыкай і іншымі жанрамі паэзіі, аб узбагачэнні іх філасофскім гучаннем, новым адценнем праблематыкі. Падмена філасофскага інтэлектуальным адбываецца, на нашу думку, з-за падмены прадметнага ідэйна-тэматычным.

І. У. Козлік размяжоўвае паняцці філасафізму і філасофскай лірыкі. Пад першым разумеецца атрыбут, прыкмета паэтычнага свету і лірычнай сістэмы канкрэтнага аўтара. У гэтым значэнні ён можа суіснаваць з іншымі прыкметамі: сімвалізмам, панегірызмам, дыдактызмам і інш. Такі філасафізм, як і блізкасць паэта да пэўных філасофскіх вучэнняў, не абавязкова ўзрасце да ўзроўню філасофскай лірыкі. Паняцце “філасофская лірыка” належыць да канцэптуальна-тэрміналагічных намінантаў, што азначаюць асобны літаратурна-мастацкі феномен з мэтай яго размежавання з іншымі літаратурна-мастацкімі з’явамі [13, с. 36].

Ю. Б. Бораў пад інтэлектуалізмам разумее змястоўна-стылістычныя асаблівасці літаратуры, якія ўзнікаюць праз насычэнне твора філасофскім пачаткам. Гэта спосаб мастацкага мыслення, які мае асаблівыя мэты, форму і стылістыку, уздзеянне на рэцэпіента [5, с. 156]. Інтэлектуалізм як яднанне філасофскага і мастацкага пачаткаў у сваіх традыцыях засноўваецца на літаратуры Асветніцтва: Д. Дзідро, Д. Дэфо, Г. Лесінг, у беларускай літаратуры – гэта паэтычная творчасць Кірылы Тураўскага, насычаная біблейскімі рэмінісцэнцыямі і алюзіямі, барочная дыдактычная паэзія С.Полацкага і інш.

А. С. Бязлепкіна звязвае інтэлектуалізм у сучаснай літаратуры з “канцэптуальнасцю, арыентацыяй пісьменніка на спазнанне свету праз розум, на закадзіраванасць літаратурнага тэксту з разлікам на інтэлектуальнага чытача, на гульню з чытачом, імкненне прасачыць скразную думку часу, ускосна ўбачыць праблемы сучаснасці праз сістэму вобразаў-сімвалаў” [11, с. 73]. Дадзенае азначэнне характарызуе постмадэрнісцкую тэхніку пісьма, што ўключала ў сябе і выкарыстанне метаду інтэлектуалізму.

І. А. Бажок у артыкуле “Інтэлектуалізм у сучаснай беларускай паэзіі” [2, с. 86–90] вылучае некалькі яго тыпаў: высокі інтэлектуалізм (глыбокі філасафізм, моцная аўтарская канцэпцыя быцця; прадстаўлены творчасцю У. Караткевіча); духоўны інтэлектуалізм (тэма веры і аўтарская ўпэўненасць у адраджэнні праз духоўнае; творчасць Р. Барадуліна); востры інтэлектуалізм (як рэакцыя на жыццёвыя і мастацкія рэаліі, можа мець сатырычны, парадыйны, камічны характар; пародыі А. Зэкава); вытанчаны інтэлектуалізм (эстэтычны падыход да кожнага радка, моцная метафорыка верша; творчасць Г. Булыка, М. Барадзіной, В. Трэнас); чысты інтэлектуалізм (аўтар імкнецца ачысціць паэзію ад пустаслоўя, звяртаецца да магчымасцей слова; прадстаўлены паэзіяй І. Бабкова, М. Баярына); гульнёвы інтэлектуалізм (мэта аўтара – мастацкая гульня з формай і зместам; прадстаўлена паэзіяй творчай суполкі “Бум-Бам-Літ”). Прыведзеная разнастайная палітра тыпаў інтэлектуалізму ў беларускай літаратуры сведчыць пра арыгінальнасць творчых індывідуальнасцей. Пад тэрмінам “інтэлектуалізм” трэба разумець творчы метад як тып духоўна-практычнага вопыту, творча засвоены пісьменнікам у якасці прынцыпу, праз прызму якога перапрацоўваецца ўсё, што аказваецца ў сферы яго творчага ўспрымання. Творчы метад вызначае структуру мастацкага зместу, з яго вынікаюць тэма і стыль. Філасофская лірыка як цэласная мастацкая структура, якая

выконвае функцыю мадэлявання рэчаіснасці, выкарыстоўвае ў тым ліку і творчы метад інтэлектуалізму. На нашу думку, з'яўленне тэрміна "інтэлектуальная лірыка" звязана з экстрапаляцыяй канкрэтнага метаду на ўсю мастацкую структуру і абагульненнем яго да ўзроўню жанру.

В. П. Рагойша ў літаратуразнаўчым даведніку "Паэтычны слоўнік" (2004) разглядае лірычны жанр перш за ўсё як тып мастацкай формы і ў залежнасці ад канкрэтнага зместу вылучае жанравыя разнавіднасці. Так, у межах артыкула "Лірыка" філасофская лірыка вылучаецца ў асобную разнавіднасць на падставе зместу, як самастойны жанр у асобным артыкуле разглядаецца медытатыўная лірыка. Паводле даведніка, медытацыя – жанр філасофскай лірыкі, у якім перадаецца глыбокі роздум паэта аб некаторых важных праблемах (жыццё і смерць, дружба і каханне, чалавек і прырода і г.д.); пачынальнікамі жанру лічацца М. Багдановіч, Я. Купала [16, с. 477]. Аналагічная дэфініцыя прадстаўлена і ў расійскім "Паэтычным слоўніку" А. Квяткоўскага, прадстаўнікамі жанру названы К. Бацюшкаў, Я. Баратынскі, А. Пушкін, М. Лермантаў, Ф. Цютчаў, А. Блок, Г. Ахматава, М. Забалоцкі і інш. [12, с. 152]. А. С. Івашчанка ў манаграфіі "Паэтыка Алеся Разанава: між медытацыяй і рацыяй" на матэрыяле творчасці А. Разанава прапаноўвае размежаваць паняцці "медытатыўны верш" і "верш-развага (роздум)" на падставе "дыяметральнай адрознасці тэкстастваральных падыходаў – медытатыўнага (заснаванага на інтуітыўнасці і назіральнасці) і разумова-рацыяналістычнага (скіраванага да фармулявання і раскрыцця пэўных ідэй, канцэптаў, усталявання прычынна-выніковых сувязей паміж прадметамі і з'явамі рэчаіснасці і г. д.)" [10, с. 112]. Тэрмін "медытацыя", вытворны з лацінскага слова meditatio (развага, роздум), не ўлічвае ўвесь спектр значэнняў гэтай з'явы. Медытацыя як духоўная ўсходняя практыка – гэта імкненне да спынення разумовага працэсу, з санскрыта "медытацыя" перакладаецца як "сузіранне, бачанне розумам, інтуітыўнае бачанне". Таму ў адносінах да вершаў філасофскага зместу (напрыклад, у творчасці Я. Купалы, М. Багдановіча, М. Танка, Я. Баратынскага, А. Пушкіна, А. Фета і інш.) А. С. Івашчанка лічыць мэтазгодным выкарыстоўваць паняцці "верш-роздум" ці "верш-развага". Сярод беларускіх пісьменнікаў, што працуюць у рэчышчы медытаўнага верша, даследчык называе А. Разанава, А. Мінкіна, І. Бабкова, сярод прадстаўнікоў замежнай літаратуры – А. Гінзбурга, Дж. Керуака.

Як жанравая разнавіднасць медытатыўнай лірыкі ў літаратуразнаўчым даведніку В. П. Рагойшы разглядаецца навуковая паэзія, аб'ектам якой з'яўляюцца навуковыя тэорыі, адкрыцці, гіпотэзы на падставе таго, што вершаванай мовай карысталіся ў філасофскіх і іншых трактатах. У якасці прыкладаў навуковай паэзіі названы асобныя творы М. Танка, А. Куляшова, А. Русецкага, С. Дзяргая. Асобна трэба адзначыць, што тэрмін навуковая паэзія быў уведзены французскім паэтам Рэнэ Гілем. Згодна з яго тэорыяй, выкладзенай у працы "Трактат пра слова" (1887), паэтычная творчасць павінна быць вышэйшым актам думкі, паэзія, як і навука, праяўляе думку, але не ў адцягненай схеме, а ў жывым вобразе. Разуменню паэзіі як выпадковага выяўлення асабістых уражанняў і інтымных перажыванняў, як схаластычнай распрацоўкі ўстаноўленых тэм супрацьпастаўляецца іншы ідэал мастацкай творчасці, паводле якога паэзія павінна мысліць, адказваць на пытанні сучаснасці, пашыраць кола тэм праз знаёмства з сучаснымі навуковымі тэорыямі светабудовы. Былому тыпу паэта-эгаіста Р. Гіль проціпастаўляе паэта-філосафа, што працягвае традыцыі паэтаў "свяшчэнных кніг" Усходу, сярод пераемнікаў якіх былі Парменід, Эмпедокл, Лукрэцый, Гётэ, Шэлі, Эміль Верхарн. Аднак М. І. Мішчанчук размяжоўвае філасофскую і навуковую лірыку на падставе таго, што апошняя пазбаўлена вобразнасці і эмацыянальнасці і трактуе паняцці ў вершаванай форме [14, с. 79]. У даведніку "Паэтычны слоўнік" няма асобнага артыкула пра філасофскую лірыку. Робіцца заўвага, што "падзел лірыкі на жанры і разнавіднасці досыць умоўны. Так, элегія можа быць не толькі сумнай, але і смешнай, сатырычнай; пейзажны верш можа мець глыбока філасофскае або востра грамадзянскае гучанне і г. д." [16, с. 47]. Такім чынам, змест паняцця "філасофскае" ў дачыненні да лірыкі звужаецца да паняцця пафасу, танальнай афарбоўкі твора, падмяняецца значэннем "філасафічнасці".

Савецкае літаратуразнаўства да пачатку 80-х гг. XX ст. ігнаравала існаванне філасофскай лірыкі ў беларускай літаратуры. Абавязковым складнікам твора абвяшчаўся грамадскі пафас, філасофстваванне без практычнага складніка адмаўлялася і забаранялася, бо не адпавядала духу

сацрэалізму як асноўнага мастацкага метаду той эпохі. Даследчык У. В. Гніламедаў быў у ліку першых, хто пачаў аналізаваць з'яву філасофскай лірыкі ў беларускай літаратуры. У кнізе "Ад даўніны да сучаснасці" У. В. Гніламедаў вылучае ў асобную філасофска-аналітычную мастацка-стылёвую плынь паэзію, якая "характарызуецца інтэлектуалізацыяй эмоцый, перавагай абстрактных мадэляў у стварэнні вобраза рэчаіснасці, зместавай ускладненасцю, тэрміналагізацыяй тропаў, ланцуговай асацыятыўнасцю, верлібрызацыяй, шырокім выкарыстаннем умоўных форм мастацкага абагульнення, дэфармацыяй хранатопу мастацкай рэальнасці" [9, с. 132]. Той жа пазіцыі прытрымліваюцца ў сваіх працах даследчыкі А. В. Барадзіхіна [3], А. І. Бельскі [4]. У сучасных даследаваннях адзначаецца схільнасць адносіць структурнае ўвасабленне філасофскай тэндэнцыі да катэгорыі стылю. Характэрнымі прыкметамі мастацка-літаратурнай плыні з'яўляюцца яе храналагічная абмежаванасць і наяўнасць знешніх арганізацыйных форм, да якіх адносяцца літаратурныя маніфесты, аб'яднанні, часопісы, выдавецтвы. Так, рамантычная плынь сфарміравала рамантычны метад мастацкага адлюстравання рэчаіснасці. Суадносіць ахарактарызаваную вышэй У. В.Гніламедавым мастацкую структуру з канкрэтным гістарычным перыядам і вызначаць яе як стылявую не ўяўляецца магчымым, як і нельга казаць пра стыль філасофскай драмы ўвогуле, але можна казаць пра стылявую плынь філасофскай драмы 1970-х гадоў.

Аналітычны агляд асноўных падыходаў да разгляду мастацкай структуры філасофскай лірыкі дае падставы адзначыць яе ўніверсальны і сінкрэтычны характар. У выніку разгляду асноўных палажэнняў па гэтым пытанні ў навуковай літаратуры можна адзначыць шэраг характэрных асаблівасцей філасофскай паэзіі:

надгістарычны, жанравы (метажанравы) характар мастацкай структуры;

структураствaральным фактарам аднесенасці да філасофскай лірыкі выступае прадмет – родавыя, сутнасныя асаблівасці свядомасці і паводзін чалавека як сацыяльнай істоты;

дамінаванне філасофскай тэмы ў цесных узаемаадносінах з філасофскай ідэяй;

мастацкая структура філасофскай лірыкі характарызуецца суб'ектнай арганізацыяй;

часава-прасторавая арганізацыя мае тэндэнцыю да пашырэння; мастацкая прастора пашыраецца да маштабаў сусвету, светабудовы, час пашыраецца да катэгорыі вечнасці праз біблейскія, міфалагічныя рэмінісцэнцыі і інш. або праз адмаўленне ад любой маркіроўкі часу;

рытмічная раскаванасць, тэндэнцыя да верлібрызацыі;

зашыфраванасць вобразаў, тэрміналагізацыя тропаў;

актыўнае выкарыстанне метаду інтэлектуалізму;

імкненне да абагульненых форм выяўлення аўтарскай свядомасці, мадыфікацыя ці фармальная адсутнасць лірычнага героя.

Сучасны стан беларускага літаратуразнаўства вымагае інтэнсіўнай распрацоўкі тэарэтыка-літаратурных праблем, найперш у межах філасофскай лірыкі. Даследаванне яе жанрава-стылявой, тэматычнай палітры прадстаўлена ў працах замежных і айчынных навукоўцаў, а шматлікія дыскусіі вакол тэрміналагічна-паняційнай азначанасці вымагаюць далейшых літаратуразнаўчых разваг.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Агеносов, В. В. Генезис философского романа / В. В. Агеносов. – М.: Прометей, 1986. – 131 с.

2. Бажок, І. А. Інтэлектуалізм у сучаснай беларускай паэзіі / І. А. Бажок // Мова–літаратура–культура: матэрыялы VI Міжнар. навук. канф., Мінск, 28–29 кастр., 2010 г.: у 2 ч. Ч. 2 / Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск: выд. цэнтр БДУ, 2011. – 310 с.

3. Барадзіхіна, А. В. Зместава-фармальныя пошукі сучаснай беларускай лірыкі. Курс лекцый па спецкурсе / А. В. Барадзіхіна; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – Гомель: УА "ГДУ імя Ф.Скарыны", 2006. – 140 с.

4. Бельскі, А. Сучасная літаратура Беларусі / А. Бельскі. – Мінск, 2000. – 237 с.

5. Борев, Ю. Б. Эстетика. Теория литературы: энцикл. словарь терминов / Ю. Б. Борев. – М.: ООО "Издательство Астрель": ООО "Издательство АСТ", 2003. – 575 с.

6. Гарадніцкі, Я. А. Думка і вобраз: Праблема інтэлектуалізму ў сучаснай беларускай лірыцы / Я. А. Гарадніцкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – 120 с.

7. Гарадніцкі, Я. А. Філасофская лірыка / Я. А. Гарадніцкі // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. Т. 5 / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [ і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1987. – 707 с.

8. Гаранин, Л. Я. Философские искания в белорусской литературе / Л. Я. Гаранин. – Минск: Наука и техника, 1984. – 222 с.

9. Гніламедаў, У. В. Ад даўніны да сучаснасці: Нарыс пра беларускую паэзію / У. В. Гніламедаў. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 246 с.

10. Івашчанка, А. С. Паэтыка Алеся Разанава: між медытацыяй і рацыяй / А. С. Івашчанка; навук. рэд. М. А. Тычына. – Мінск: БНТУ, 2008. – 144 с.

11. Інтэлектуалізм у літаратуры // 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру / А. П. Бязлепкіна. – Мінск: Лімарыус, 2012. – 224 с.

12. Квятковский, А. П. Поэтический словарь / А. П. Квятковский; науч. ред. И. Роднянская. – М.: Сов. энцикл., 1966. – 376 с.

13. Козлик, И. В. Теоретическое изучение философской лирики и актуальные проблемы современного литературоведения: автореф. монографии / И. В. Козлик; Прикарпатский нац. ун-т им. В.Стефаника, Ин-т филологии. – Ивано-Франковск: Полискан, 2009. – 39 с.

14. Мищенчук, Н. И. Преломление традиций классической философской лирики в белорусской поэзии первой половины XX века / Н. И. Мищенчук // Мировой литературный процесс: автор – жанр – стиль: сб. науч. тр. – Брест, 2009. – С. 77–81.

15. Поспелов, Г. Н. Лирика среди литературных родов / Г. Н. Поспелов. – М.: Изд-во МГУ, 1976. – 208 с.

16. Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 576 с.

17. Рагойша, В. П. Уводзіны ў літаратуразнаўства: вучэб. дапам.: у 2 ч. Ч. 1: Літаратуразнаўства як навука. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка / В. П. Рагойша, М. П. Кенька, Т. А. Марозава; пад рэд. В. П. Рагойшы. – Мінск : БДУ, 2011. – 247 с.

18. Спивак, Р. С. Русская философская лирика. 1910-е годы. И. Бунин, А. Блок, В. Маяковский: учеб. пособие / Р. С. Спивак. – 2-е изд. – М.: Флинта: Наука, 2005. – 408 с.

19. Шаўлякова-Барзенка, І. Паэзія рэча(ў)існасці (Творчая індывідуальнасць Алеся Бадака) / І. Шаўлякова-Барзенка // Полымя. – 2016. – № 2 (1036). – Мінск: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова “Выдавецкі дом “Звязда”, 2016. – 191 с.

## References

1. Agenosov V. V., Genezis filosofskogo romana [The Genesis of the Philosophical Novel], Prometei, Moscow, RU, 1986.

2. Bazhok I. A., “Intellectualism in the Modern Belarusian Poetry”, Materyialy VI Mizhnarodnai navukovai kanferentsii "Mova-litaratura-kul’tura", Minsk, 28-29 kastrychnika 2010 g., u 2 ch. Ch.2 [Proceedings of the 6th International Scientific Conference “Language-Literature-Culture” Minsk, October 28–29, 2010 in 2 parts, Part 2], Publ. centr. BSU, Minsk, BY, 2011, pp. 86–90.

3. Baradzikhina A.V., Zmestava-farmal’nyia poshuki suchasnai belaruskai liryki. Kurs lektsyi pa spetskurse [Search for Content and Form in the Modern Belarusian poetry: A Special Course of Lectures], GSU by F. Skaryny, Gomel, BY, 2006.

4. Bel’ski A., Suchasnaia litaratura Belarusi [Modern Literature of Belarus], AVERSEV, Minsk, 2000.

5. Borev Iu. B., Estetika. Teoriia literatury: Entsiklopedicheskii slovar’ terminov [Aesthetics. The Theory of Literature: Encyclopedic Dictionary of Terms], AST, Moscow, RU, 2003.

6. Garadnitski Ja. A., Dumka i vobraz: Prablema intelektualizmu ў suchasnai belaruskai lirytsy [Thought and Image: The problem of Intellectualism in the Modern Belarusian Lyrics], Science and technology, Minsk, BY, 1986.

7. Garadnitski Ja. A., Filasofskaia liryka. Entsiklapedyia litaratury i mastatstva Belarusi u 5 t. T. 5 [Philosophical Lyrics. Encyclopedia of Belarusian Literature and Art in 5 volumes, Volume 5], BelSE, Minsk, 1987.

8. Garanin L. Ja., Filosofskie iskaniia v belorusskoi literature [Philosophical Trends in Belarusian Literatura], Science and technology, Minsk, BY, 1984.

9. Gnilamedaў U. V., Ad daўniny da suchasnastsi: Narys pra belaruskuiu paeziiu [From Ancient Times to the Present: An Essay on the Belarusian Poetry], Fiction, Minsk, BY, 2001.

10. Ivashchanka A. S., Paetyka Alesia Razanava: mizh medytatsyiai i ratsyiai: managrafiia [Ales Ryazanov’s Poetics: Between Meditation and Mind: A Monograph], BSTU, Minsk, BY, 2008.

11. Biazlepkina A. P., Intelektualizm u litaratury. 100 sloў pra suchasnuiu belaruskuiu litaraturu [Intellectualism in Literature. 100 Words about Modern Belarusian Literature], Limaryus, Minsk, BY, 2012.

12. Kviatkovskii A. P., Poeticheskii slovar’ [The Dictionary of Poetry], Sov. Enc., Moskow, RU, 1966.

13. Kozlik I. V., Teoreticheskoe izuchenie filosofskoi liriki i aktual’nye problemy sovremennogo literaturovedeniia [A Theoretical Study of Philosophical Lyrics and Relevant Problems of Modern Literary Studies], Poliskan, Ivano-Frankovsk, UA, 2009.

14. Mishchenchuk N. I., “The Refraction of Traditions of Classical Philosophical Lyrics in the Belarusian Poetry of the First Half of the Twentieth Century”, in Sen'kevich T.V. (ed.), Mirovoi literaturnyi process: avtor – zhanr – stil’. Sb. nauchn. trudov [The World Literary Process: Author – Genre – Style. Collection of Scientific Writings], BrGU imeni A. S. Pushkina, Brest, BY, 2009, pp. 77–81.

15. Pospelov G. N., Lirika sredi literaturnykh rodov [Lyrics among Literary Genres], MSU, Moscow, RU, 1976.

16. Ragoisha V. P., Paetychny sloŭnik [The Dictionary of Poetry], Bel. science, Minsk, BY, 2004.

17. Ragoisha V. P., Uvodziny ŭ litaraturaznaŭstva: vuchebny dapamozhnik u 2 ch. Ch. 1 [Introduction to Literary Science: A Tutorial in 2 parts, Part 1], BSU, Minsk, BY, 2011.

18. Spivak R. C., Russkaia filosofskaia lirika. 1910-e gody. I. Bunin, A. Blok, V. Maiakovskii: Uchebnoe posobie [Russian Philosophical Lyrics. 1910s. I. Bunin, A. Blok, V. Mayakovsky: A Textbook], Flinta, Science, Moscow, RU, 2005.

19. Shaŭliakova-Barzenka I., "The Poetry of Reality (Ales Badak's Creative Individuality)", Polymia [Flame], 2016, no. 2 (1036), pp. 101–106.

## Информация об авторе

*Панфилова Анастасия Сергеевна* – аспирант. ГНУ «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси» (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail : anaspanf@gmail.com.

## Information about the author

*Panfilova Anastasiya Sergeevna,* Postgraduate Student, Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: anaspanf@gmail.com.

## Для цитирования

Панфілава, А. С. Герменеўтыка жанру філасофскай лірыкі / А. С. Панфілава // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 2. – С. 91–98.

## For citation

Panfilova A. S. Hermeneutics of the Philosophical Lyrics Genre. Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, humanitarian series, 2017, no. 2, pp. 91–98.